# Неардынарнасць асобы

«Нястомны руплівец беларускай культуры» — такую назву мела вечарына, прысвечаная 75-годдзю знакамітага беларускага культурнага дзеяча, заслужанага работніка культуры Беларусі Віктара Губіча, якая прайшла ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага.

**Любоў ТУРМАСАВА**

Віктар Аляксандравіч нарадзіўся 15 снежня 1937 года ў вёсцы Лясковічы Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці ў шматдзетнай сям'і. Скончыў Гродзенскае культурна-асветнае вучылішча, працаваў у Дзяржынскім сельскім клубе Зэльвенскага раёна. Служыў у арміі. Пасля вярнуўся ў Зэльвенскі раён і заняў пасаду дырэктара Зэльвенскага раённага Дома культуры. Ужо там вызначыўся яго арганізатарскі талент, творчы падыход да любой клубнай справы. У 1962 годзе жыццёвы шлях прывёў Віктара Аляксандравіча ў Вялікую Бераставіцу.

Па заканчэнні Маскоўскага інстытута культуры Віктар Губіч быў запрошаны на пасаду намесніка начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама. Менавіта тут у поўнай меры раскрыліся неардынарнасць яго асобы, прафесіяналізм і захопленасць любімай справай.

Падчас мерапрыемства дзейнічала кніжна-ілюстрацыйная выстаўка, на якой былі прадстаўлены каштоўныя дакументы пра жыццёвы і творчы шлях В. Губіча. Сярод іх — узнагароды: пасведчанні аб прысваенні званняў «Заслужаны работнік культуры БССР», знака Міністэрства культуры СССР «За выдатную работу», Ганаровая залатая адзнака Польскага агенцтв INTERPRESS ды іншыя. Таксама был прадстаўлены артыкулы пра віноўнік ўрачыстасці з выданняў энцыклапе дычнага кшталту, яго інтэрв'ю, пуб лікацыі пра фестывалі, святы, агляды мастацкай самадзейнасці, што змя шчалі не толькі мясцовыя, але і рэс публіканскія перыядычныя выданні «Мастацтва Беларусі», «Літаратура мастацтва» і г. д.

Выстаўка аздоблена і разнастайным фотаздымкамі, якія ўзнаўляюць прафесійнае і асабістае жыццё Віктара Губіча.